***В.І. Караткевіч (Магілёў)***

# ПЕРСАНАСФЕРА ДРАМАТУРГІЧНЫХ ТВОРАЎ МІКОЛЫ МАТУКОЎСКАГА (НА МАТЭРЫЯЛЕ КАМЕДЫЙ "МУДРАМЕР" І "ЗОМБІ, АЛЬБО МУДРАМЕР – ДВА")

Вывучэнне персонасферы беларускай культуры яшчэ не стала традыцыйным аб'ектам даследавання беларускіх культуролагаў, філолагаў, псіхолагаў… Тым не менш, даследаванне персонасферы нацыянальнай культуры на пэўным этапе яе развіцця дасць магчымасць глыбей выявіць тыя працэсы, якія адбываюцца ў нашым грамадстве.

У кантэксце нашага даследавання мы звяртаемся да паняцця "персонасфера" выключна як да літаратурнага феномену, які дае магчымасць выявіць некаторыя асаблівасці развіцця прыгожага слоўнага мастацтва і змен у грамадскай думцы.

Абагульняючы тэарэтычныя працы [1, 6, 7, 8], вылучым пэўныя зыходныя, якія трэба ўлічваць пры аиалізе персонасферы. У адпаведнасці з сучаснымі ўяўлеинямі пра культуру, гэта *"ад'ектыўнасць-кансалідацыйнасць аб'ектаў-прадметаў-мадэляў-выяў-іерархій-парадыгм-эталонаў, якія генерыраваны-рэпрадукаваны чалавецтвам на працягу многіх стагоддзяў-тысячагоддзяў у канстэляцыі-кан'юнкцыі з феноменамі-фактарамі соцыуму-экзістэнцыі-палітыкі-эканомікі-прамысловасці-вытворчасці-быту-адпачынку <…>"*[42] [6, с. 363–364]. З гэтага вынікае, што культура прадстаўлена пэўнымі рэаліямі матэрыяльнага і нематэрыяльнага характару, частка з якіх можа быць вызначана як аб'екты "персонасферы". Расійскі даследчык Г.Г. Хазагераў дае наступнае вызначэнне гэтаму паняццю: *"гэта сфера персаналій, вобразаў, сфера літаратурных, гістарычных, фальклорных, рэлігійных персанажаў. <…> Персонасфера – жывое, адушаўлёнае насельніцтва планеты канцэптаў. Яна знаходзіцца з гэтай планетай у такіх жа адносінах, у якіх*

[42]Тут і далей пераклад з рускай мовы наш. – В.К.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*біясфера – з геасферай. У якасці наасферы, відаць, можна разглядаць «гаворачую» частку персонасфер”* [8, с. 133]. Адсюль вынікае, што персонасфера можа разглядацца ў кантэксце характарыстыкі культурных змен чалавецтва, нацыі, сацыяльнай групоўкі, асобнага чалавека, бо пэўныя вобразы (рэлігійныя, фальклорныя, гістарычныя, літаратурныя і пад.) трансфармуюцца і асэнсоўваюцца па-свойму, зыходзячы з новых гістарычных рэалій, сацыяльнага вопыту таго або іншага грамадства. Рэцыніент мастацкага твора ў залежнасці ад свайго культурнага ўзроўню, эмацыйнага тыпу разглядае свет праз персонасферу, супастаўляючы свае ўчынкі, паводзіны іншых людзей з пэўнымі персанажамі мастацкіх твораў, пры гэтым апошнія набываюць часцей дадатковыя рысы і характарыстыкі. Кожная эпоха і кожнае нацыянальнае грамадства жывуць ва ўласнай персонасферы, якая служыць асновай для нацыянальна-культурнай кансалідацыі. Асноўнай крыніцай для персонасферы служыць літаратура, якая *“ёсць мысленне ў вобразах, і многія з гэтых вобразаў уваходзяць у грамадскую памяць нацыі або нават у памяць усяго чалавецтва”* [7, с. 45].

Заўважым, што тэатральнае дзеянне ў межах дыялектычнай пары “дзеянне/характар” мае міметычны характар: імітацыя ў выяўленчым значэнні (фігуратыўнае адлюстраванне найбольш значных характараў) і праксіс (імітацыя найбольш характэрных дзеянняў). Зыходзячы з гэтага, аналіз драматургічнага твора з пазіцый выяўлення персонасферы бачыцца нам вельмі прадуктыўным: дае магчымасць выявіць праз сістэму вобразаў паказальныя з’явы і праблемы, а таксама, як правіла, шляхі вырашэння гэтых праблем на пэўным этапе развіцця грамадства.

Паказальнымі для выяўлення персонасферы з’яўляюцца драматургічныя творы М. Матукоўскага. У межах нашага даследавання звернем увагу на своеасаблівую дылогію – “Мудрамер” (1986) і “Зомбі, альбо Мудрамер – два” (1998).

Першы з названых твораў у свой час, па сведчанні С.С. Лаўшука, меў значны поспех: *“На гэты спектакль* [Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы па п’есе “Мудрамер”. – В.К.] *глядач пайшоў вельмі ахвотна. Глядзельную залу напаўнялі людзі самых розных сацыяльных груп і ўзростаў, якія прыходзілі сюды, каб атрымаць асалоду ад па-сапраўднаму вясёлага, займальнага відовішча. На «Мудрамеры» заўсёды адбывалася дзівоснае паяднанне сцэны і залы, што сведчыла аб беспамылковай дасведчанасці аўтара п’есы ў складаным свеце грамадскіх арыентацый і зацікаўленасцей”* [3, с. 10]. Гэты спектакль дастаткова хутка атрымаў Дзяржаўную прэмію Беларусі. Пра папулярнасць твора М. Матукоўскага сведчыць і той факт, што паводле “Мудрамера” рэжысёрам В. Панамаровым у 1988 годзе быў зняты аднайменны фільм.

Зыходзячы з адзначанага вышэй, можам сцвярджаць, што ў п’есе былі сапраўды выведзены паказальныя вобразы, якія закранулі вялікую рэцэпцыйную аўдыторыю, і гэтыя вобразы могуць разглядацца на ўзроўні персонасферы беларускага грамадства канца 80-х гадоў XX стагоддзя.

Асаблівасцю твора з’яўляецца той факт, што ў фінале сатырычнай камедыі (аўтарскае жанравае вызначэнне) зло не пакарана, нават не выкрыта, а, наадварот, прымае іншую форму, яшчэ больш вытанчаную, удасканаленую, і таму яно становіцца больш жахлівым. Тут няма звышідэй, маштабных, значных герояў. Персонасфера будуецца па прынцыпе мазаічнасці вобразнай сістэмы: кожны герой твора мае сваю гісторыю, на прыкладзе якой раскрываецца пэўная праблема, пры гэтым усе героі аб’яднаны адной прасторай і, як правіла, адной справай. У творы М. Матукоўскага гэта справа – атрымаць станоўчую рэзалюцыю Віктара Паўлавіча Вяршылы – міністра ўзгадненняў.

У вобразнай сістэме твора выразна вылучаецца два планы: на адным баку бюракраты – міністр і яго намеснікі, а таксама яго сакратарка, на другім – наведвальнікі (вынаходнікі Мікалай Ягоравіч Мурашка і Іван Пятровіч Залівака, “бабуля-празарлівіца” Кацярына Антонаўна Загуменная, дырэктар фабрыкі Ніна Іванаўна Крутая). Гэта людзі розныя па сваіх разумовых дадзеных, культурным і эмацыйным узроўні, але ўсе яны становяцца закладнікамі бюракратычнай сістэмы, дзе нават труну нельга купіць без узгаднення.

Кожны з іх, за выключэннем хіба Залівакі, маюць як станоўчыя, так і адмоўныя рысы характару, што ўскладняе сэнсавае напаўненне твора і з’яўляецца парушэннем законаў тыпізацыі ў сатырычнай камедыі. Дэталі ўнутранага свету кожнага з прадстаўленых тыпаў выяўляюцца праз дачыненне тым або іншым чынам да вынаходніцтва Мікалая Мурашкі – дурамера, які Вяршыла прапануе назваць мудрамерам, каб ніхто нічога не падумаў: *“Мы ж не можам напісаць у*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*афіцыйным дакуменце , што рэкамендуем у серыйную вытворчасць нейкі «дурамер»... Што пра нас падумаюць? Што ўсе мы трошкі таго... "* [4, с. 27].

Гэта апарат выконвае ролю своеасаблівай дзейнай асобы – прынцыповага непадкупнага суддзі, які імкнецца расставіць усе кропкі над "і", але няшчадна знішчаецца сваім вынаходнікам у фінале, бо перамагчы сістэму не ў стане. Сам жа апарат патэнцыйна можа стаць зброяй такіх дурняў, як Залівака.

Паглыбленне крызісных уяўленняў у грамадстве, дзе панаванне бюракратычнай сістэмы замяняецца панаваннем грошай, а чэрствасць і раўнадушша, духоўная дэградацыя становяцца паказальнымі рысамі часу, адлюстравана ў другой п'есе з дылогіі М. Матукоўскага – "Зомбі...". Як адзначае сам аўтар у прадмове да яе, гэты твор наватарскі, бо ў ім зроблена спроба прасачыць за лёсам герояў, паглядзець, што з імі можа здарыцца за дзесяць гадоў. Гэты факт дае падставы лішні раз упэўніцца ў тым, што мы маем справу менавіта з катэгорыяй персонасферы – паказальнай для адлюстравання грамадскіх змен вобразнай сістэмай.

У пэўнай ступені п'еса адпавядае патрабаванням і ўстаноўкам альтэрнатыўнага нетрадыцыйнага "тэатра без спектакля" (мінарытарнага тэатра). Сутнасць пошукаў прыхільнікаў такога тэатральнага мастацтва заключаецца ў тым, што аўтары ствараюць парафразы на тэмы класічных твораў, даюць магчымасць развіцца ў п'есах другасным героям за кошт галоўных (як, напрыклад, у італьянскага драматурга, рэжысёра і акцёра Кармэла Бенэ другасны персанаж Шэкспіра Меркуцыа за кошт Рамэа выходзіць на першы план). Такі падыход да вырашэння праблемы рэалізацыі ідэй, кампазіцыі спектакляў па "абноўленых" п'есах разглядаецца прыхільнікамі постмадэрнізму як прыём, што вядзе да паглыблення крытычнай функцыі тэатра.

У нашым выпадку галоўны герой "Мудрамера" вынаходнік Мікалай Ягоравіч Мурашка таксама адыходзіць на другі план і нават ператвараецца чамусьці ў юрыдычна іншага чалавека – малодшага навуковага супрацоўніка інстытута Мурашку Мікалая Іванавіча. На першы ж план выходзіць герой зусім іншай п'есы М. Матукоўскага – "Амністыя" – Рыгор Салавейчык, які ў "Зомбі... " набывае імя па бацьку – Рыгоравіч. Здаецца, героі "Зомбі..." тыя ж, што ў "Мудрамеры" і "Амністыі", але яны – як абсурднае люстэркавае адлюстраванне сваіх "прататыпаў". Магчыма, гэта зроблена аўтарам спецыяльна, каб паказаць алагізм нашага часу. Ці бывае так, напрыклад, каб за якія дваццаць гадоў "слесар-самародак" Рыгор Салавейчык зрабіў кар'еру і даслужыўся да высокага кіраўніка, палкоўніка міліцыі, "справядліўца" і вельмі правільнага? Вывады, да якіх прыйшоў Матукоўскі несуцяшальныя: чалавек у гэтым свеце – істота чужая. Аўтар імкнецца вывучыць магчымасці неўсвядомленага ў чалавечай псіхіцы. Драматург ставіць чалавека ў залежнасць ад волі іншага чалавека, але зноў добры намер абарочваецца несуцяшальным вынікам: памкненні Мурашкі кіраваць воляй маргінальных асоб заканчваюцца крахам надзей.

Такім чынам, аналіз дылогіі М. Матукоўскага дае падставы сцвярджаць наступнае.

Персонасфера як сэнсаўтвараючы кампанент мастацкага твора дае магчымасць прасачыць за зменамі ў грамадскай свядомасці.

Драматург стварае дастаткова паказальныя для беларускага грамадства канца XX стагоддзя вобразы, характэрныя для персонасферы.

Праз персонасферу "мудрамераў" паказваецца стадыя развітання беларусаў з блакітнымі марамі эпохі будаўніцтва ўтанічнага грамадства і дамінаваннем праблемы сацыяльнай справядлівасці ў беларускай мадэлі постмадэрнісцкага мастацтва [2, с. 12–13]. А таксама канстатуецца паглыбленне крызісных з'яў у эканоміцы і душах звычайных людзей. Драматург адлюстроўвае няздольнасць людзей да становучага дзеяння, нягледзячы нават на такія памкненні. Больш за тое, у "Зомбі..." паказваецца немагчымасць рэалізацыі добрых намераў ва ўмовах духоўнага крызісу, калі жаданні людзей зводзяцца да жывёльных інстынктаў.

**ЛІТАРАТУРА:**


1. Гекман, Л.П. Персоносфера традиционной культуры: теоретико-методологический аспект / Л.П. Гекман // Весник АлтГТУ им. И.И. Ползунова. – 2006. – № 1. – С. 74–75.
2. Караткевіч, В.І. Тэарэтычныя і гістарычныя аспекты постмадэрнізму ў беларускай літаратуры другой паловы 80–90-х гадоў XX стагоддзя / В.І. Караткевіч. – Магілёў : МДУ імя А.А. Куляшова, 2003. – 22 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

3. Лаўшук, С.С. Здавён тэатрам зачараваны / С.С. Лаўшук // Матукоўскі, М. Апошняя інстанцыя : п’есы / М. Матукоўскі. – Мінск : Маст. літ., 1996. – С. 3–12.
4. Матукоўскі, М. Апошняя інстанцыя : п’есы / М. Матукоўскі. – Мінск : Маст. літ., 1996. – 271 с.
5. Матукоўскі, М. Зомбі, альбо Мудрамер – два : сучасная камедыя / М. Матукоўскі // Полымя. – 1998. – № 7. – С. 60–104.
6. Современный словарь по культурологи / автор-сост. В.В. Юрчук. – Минск : Современное слово, 1999. – 736 с.
7. Хазагеров, Г.Г. Основы теории литературы / Г.Г. Хазагеров, И.Б. Лобанов. – Ростов н/Д : Феникс, 2009. – 316 с.
8. Хазагеров, Г. Персоносфера русской культуры / Г. Хазагеров // Новый мир. – 2002. – № 1. – С. 133–145.
хив библиотеки МГУ имен